Список использованных источников:

1. Воробьёва, А. В. Исследовательские компетенции современного школьника / А. В. Воробьёва// Дискуссия: педагогика и психология. – 2013. – № 3. – С. 7–10.
2. Осипова, С. И. Развитие исследовательской компетентности одарённых детей [Текст] / С.И. Осипова. – ГОУ ВПО «Государственный университет цветных металлов и золота» www.fkgru.ru/conf/17.doc.
3. Полат, Е.С. Метод проектов на уроках иностранного языка/ Е.С. Полат// Иностранные языки в школе. 2000. - № 2.

## ВЫВУЧАЕМ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ Ў І КЛАСЕ З ДАПАМОГАЙ ГУЛЬНІ

**В. А. Аксакава, настаўнік пачатковых класаў**

*ДУА “Сярэдняя школа № 16 г. Пінска”, г. Пинск, Республика Беларусь*

Зрабіць навучанне дзяцей грамаце цікавым і радасным – мара кожнага настаўніка. Задача настаўнікаў у гэты час - зрабіць так, каб сустрэча з незнаёмым не спалохала, не расчаравала, а, наадварот, спрыяла ўзнікненню цікавасці да вучэння.

У 1-м класе пачынаецца вывучэнне беларускай мовы з вуснага курса, калі дзеці не ўмеюць чытаць. Таму на гэтым этапе неабходна ўвесці дзяцей у свет беларускага слова, вучыць успрымаць на слых і разумець родную мову, фарміраваць элементарныя навыкі чытаць па-беларуску, пашыраць слоўнікавы запас вучняў, развіваць інтарэс да вывучэння беларускай мовы. Такую работу можна пачынаць з гульнявога матэрыялу (словы, сказы, тэксты) толькі праз слыхавое ўспрыманне ці з дапамогай малюнкаў. Уключэнне ва ўрок гульняў, скорагаворак, рэбусаў, загадак робіць працэс

навучання цікавым, стварае ў вучняў бадзёры рабочы настрой, знімае стомленасць.

Змест навучання беларускай мове дазваляе выкарыстоўваць гульні розных тыпаў: слоўныя, рухавыя, сюжэтна-ролевыя, гульні-драматызацыі. Дзеці, захопленыя гульнёй, лягчэй засвойваюць праграмны матэрыял. Таму што гульнёвая дзейнасць яшчэ застаецца адной з вядучых. Падчас правядзення гульняў трэба ўлічваць шэраг асаблівасцей, прадыктаваных магчымасцямі вучняў на кожным этапе навучання. [4, с.27].

Роля займальнасці як яркага, эмацыянальнага сродку ў актывізацыі навучальнага працэсу неаднаразова падкрэслівалася айчыннымі і замежнымі вучонымі. Як сцвярджае У.Б.Бандарэўскі, займальнасць “абуджае цікаўнасць, цікаўнасць пераходзіць у дапытлівасць і абуджае інтарэс да прадмета, што ў сваю чаргу нараджае патрэбнасць у глыбокім авалоданні ведамі і вядзе да раскрыцця і развіцця патэнцыяльных задаткаў і здольнасцей”.

У сувязі з тым, што вучні маюць абмежаваны слоўнікавы запас, ім складана выказаць на беларускай мове ўласныя меркаванні. Таму на вучэбных занятках патрэбна дапамагаць дзецям паведаміць незнаёмую назву ці патлумачыць значэнне незразумелага слова. Выпраўляць памылкі спакойным тонам, добразычліва, каб у вучня не выклікаць страх, не знізіць маўленчую актыўнасць.

Кожная група гульняў класіфікавана ў адпаведнасці з задачамі навучання.

## Фанетыка-артыкуляцыйныя гульні

Фанетыка-артыкуляцыйныя гульні накіраваны на фарміраванне фанетычнага слыху і вымаўленчых навыкаў. Комплекс гульняў (склады, словы, сказы) прадугледжвае, што вучні паўтараюць за настаўнікам па ўзоры, аналізуюць сваё маўленне. Падчас правядзення гульняў ідзе актыўная падрыхтоўка да чытання слоў, сказаў, тэкстаў.

**Гульня “Хто ўважлівы?”**

Назавіце, што ці каго вы бачыце на малюнках. З якога гука пачынаюцца словы?

(Грыб, горн, гусь, граблі, груша – з гука [г]).

Настаўнік называе словы. Калі ён назаве слова з гукамі [г], [г'] – вучні падымаюць рукі ўверх, калі ў слове няма гукаў [г], [г'] – разводзяць рукі ў бакі.

Словы для гульні: гадзюка, дарога, хата, гай, рука, нага, хлеб, грыб, вуліца, хамяк, гараж, халат, гара, футра, глобус, гітара, хітрэц, галава, кара. [2, с.38].

**“Аркестр”**

Дыдактычная задача: фарміраваць навык вымаўлення гука [дз`].

Вучні падзяляюцца на дзве групы. Адна група (цымбалісты) вымаўляе: “Дзілі-дзілі-дзілі-дон”. Другая група (дзеці, якія іграюць на званочках): “Дзінь-дзінь-дзінь. “Аркестранты” па чарзе выконваюць мелодыі знаёмых песень з дапамогай гукаперапймальных слоў. Дзеці павінны здагадацца, якая гэта песня.

**“Пазнайце гук”**

Настаўнік называе слова з гукам [дж] – усе падскокваюць, без [дж] – прысядаюць. Хто зробіць няправільна, выходзіць з гульні.

Словы для гульні: джала, чапяла, дзяўчынка, ваджу, хачу, дажджы, вожык, лячу, буджу, гляджу, сачу, хаджу, вярчу, сяджу.

**“Фанетычныя зарадкі”:**

Як спяваюць, калі калышуць малое дзіця? (А-а-а…).

Як гагочуць гусі? (Га-га-га…).

Як гудзе жук? (Ж-ж-ж…).

Як кот лашчыцца? (Мур-мур-мур…).

Як кот просіць есці? (Мяў-мяў-мяў…).

Як паветра выходзіць з шарыка? (С-с-с…).

Як шыпіць змяя? (Ш-ш-ш…).

**“Чыстагаворкі”**

Джу-джу-джу – на градцы бульбу пасаджу.

Джы-джы-джы – пальюць яе дажджы.

Джа-джа-джа – будзе добры ўраджай.

Ба-ба-ба - на двары расце вярба.

Бы-бы-бы – цягне дзетак да вярбы.

Бе-бе-бе – вісяць арэлі на вярбе.

Бу-бу-бу – любяць дзеці ўсе вярбу. [1, с.40].

Выкарыстанне гульняў для правядзення **“Хвілінак адкрыццяў”** памагае арганізаваць актыўнае назіранне за граматычнымі і сінтаксічнымі з`явамі беларускай мовы.

**“Хто які голас падае?”**

Бусел клякоча, варона каркае, журавель курлыкае, зязюля кукуе, шпак свішча, сініца цінькае, салавей цёхкае, верабей чылікае, жаба квакае, змяя шыпіць, воўк вые, мядзведзь рыкае.

**“Хто ў каго?”**

Вучням неабходна дапоўніць сказ патрэбным словам. З дапамогай гэтай гульні дзеці вучацца, як называюць дзіцянят у свойскіх жывёл.

У авечкі … (ягня). У кабылы …(жарабя). У казы …(казляня). У каровы …(цяля). У свінні …(парася). У кошкі …(кацяня). У сабакі …(шчаня).

**“Адкажы хутка”**

**Дыдактычная задача:** практыкаваць у правільным дапасаванні прыметнікаў да назоўнікаў. Настаўнік пытаецца: карычневы, футравы – гэта шуба ці каўнер? Дзеці выбіраюць падыходзячы назоўнік і адказваюць: карычневы, футравы каўнер.

## Рухавыя гульні

Рухавыя гульні мэтазгодна праводзіць у якасці фізкультхвілінак. Для развіцця граматычнага ладу маўлення выкарыстоўваюць такія рухавыя гульні як “Лянок”, “Пасадка бульбы”, “Вожык і мышы”. Мэтазгодна, каб гульні былі насычаныя рыфмаваным моўным матэрыялам, заклічкі і лічылкі, у якасці якіх могуць ужывацца ўрыўкі з вершаў беларускіх паэтаў.

**“Фізкультхвілінкі”** (імітуюцца адпаведныя рухі)

1.Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Тупаем нагамі.
Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Пляскаем рукамі.
Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Будзем нахіляцца.
Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Сядзем зноў займацца.

2.Сонца спіць, неба спіць,
Нават вецер не шуміць.
Раннім ранкам сонца ўстала
І праменні ўсім паслала.
Павеяў раптам вецярок,
Неба хмарай завалок.
Дождж па даху грукаціць,
У жалабок вада бяжыць.
Сонейка зайшло за хмару,
І не бачым яго твару.

**“Лічылкі”**

Бусел, бусел, клякатун,

Схапіў жабу за каўтун.

Цёгаў, цёгаў, валачыў,

Покі дождж не намачыў.

**Лянок**

Мэта: практыкаваць ва ўменні ўзгадняць рухі са словамі песні. Выхоўваць пачуццё калектывізму, цікавасць да народнага фальклору.

Апісанне гульні: з ліку тых, хто прымае ўдзел у гульні, выбіраецца «бабуля».

Астатнія становяцца у круг. Яны пытаюцца:

— Што ты, бабуля, нам прасці дасі?

Бабуля выходзіць у цэнтр круга і адказвае:

— Старым бабулькам воўны пасмачку,

А прыгожым маладзічкам белы лянок!

Пасля гэтага дзеці разам з бабуляй пачынаюць спяваць, паказваючы рухамі дзеянні, пра якія гаворыцца у песні:

А мы сеялі, сеялі лянок,

Белы, слаўны кужалёк!

Урадзіся наш лянок!

Урадзіся кужалёк.

Мы лянок ірвалі, жалі,

У снапочкі збіралі.

Урадзіўся лянок

Белы, слаўны кужалёк.

Правілы гульні: дзеці павінны дакладна выконваць дзеянні, якія паказвае «бабуля». [3, с.10].

На ўроках беларускай мовы дыдактычныя гульні дапамагаюць ў фарміраванні пазнавальнай цікавасці да прадмета, актывізацыі разумовай дзейнасці; развіцці назіральнасці, забяспечванні даступнасці праграмнага матэрыялу. Заўсёды лягчэй запомніць тое, што цікава. Гульня дапамагае

вучням і ў зніжэнні псіхічных і фізічных нагрузак. Настаўнік павінен не толькі выкладаць свой урок, але і захапляць дзяцей, тым самым ствараць глебу для лепшага ўспрымання вялікага і складанага матэрыялу.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Максімук, Н.М. Дыдактычныя гульні для шасцігодак. Метад. дапаможнік для настаўніка/ Н.М.Максімук. –Мінск: Нар.асвета, 1991.-44 с.
2. Солахаў, А.В. Падарожжа ад А да Я. Дапаможнік для настаўнікаў/ А.В.Солахаў. - Мінск: Зорны Верасок, 2012.-262 с.
3. Старжынская, Н.С. Сябруем і гуляем разам/ Н.С.Старжынская.-Мінск: Нар. асвета, 1994, 80 с.
4. Пачатковая школа.- 2006.-№6.- 60 с.

## АСНОВЫ ПРАЦЫ З ЗАГАДКАМІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

**Н. В. Аліева, настаўнік пачатковых класаў**

*ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Пінска», г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

Зыходзячы з Канцэпцыі нацыянальнага выхавання, актуальнасці ідэалагічнай работы на сучасным этапе, адным з важнейшых прынцыпаў выхаваўчага працэсу з’яўляецца сацыяльна-культуралагічны, які вызначаецца прызнаннем і асэнсаваннем нацыянальна-культурных традыцый, адраджэннем і развіццем культуры свайго народа, фарміраваннем нацыянальнай самасвядомасці. Таму адна з важнейшых задач сенняшняй школы – выхаванне інтэлектуальна развітай, духоўна багатай, нацыянальна свядомай творчай асобы. Без вырашэння гэтай задачы немагчыма паспяхова ажыццявіць праграму нацыянальнага адраджэння, бо без ведання сваіх вытокаў немагчыма па-сапраўднаму палюбіць родны край, яго спадчыну, стаць патрыетам.